Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЖНІЎНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 146 (28256)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хлебаробы ў пагонах**

СТАР. 6



**У Бярозе ўмеюць «ткаць урэдко»**

СТАР. 9



**Яна была актрысаю...**

СТАР. 10

*ЛІЧБА ДНЯ*

**456 жыхароў**

*Беларусі пераадолелі стогадовы рубеж. Сярод рэгіёнаў краіны лідарам па колькасці доўгажыхароў традыцыйна з'яўляецца Гродзенская вобласць: тут на 1 ліпеня пражывалі 97 чалавек, старэйшых за 100 гадоў. На другім месцы — Мінская і Віцебская вобласці (па 70), на трэцім — Гомельская (62). У Брэсцкай вобласці пражывалі 59 чалавек, якія адзначылі свой векавы юбілей, у Мінску — 51, у Магілёўскай вобласці — 47. Варта заўважыць, што жанчыны пераважаюць сярод айчынных доўгажыхароў з сяміразовай перавагай: свой 100-гадовы юбілей ужо адзначылі 401 жанчына і 55 мужчын. На 1 ліпеня гэтага года ў краіне налічвалася шэсць беларусаў ва ўзросце 110 гадоў і старэйшых.*

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 2.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9799 ▼ |
| Еўра | 2,2102 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0299 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0797 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Святкуем!

## ПА ГАЛОЎНАЙ ВУЛІЦЫ З ГАРМОНІКАМ



Фота БЕЛТА

Усе чатыры паласы цэнтральнай вуліцы ў Ельску занялі ў мінулыя выхадныя гарманісты, якія прыехалі ў невялічкі палескі гарадок не толькі з розных рэгіёнаў Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Малдовы, Эстоніі.

СТАР. 12

■ Каб памяталі

## ЭКІПАЖ АДЛЯТАЕ Ў ВЕЧНАСЦЬ...

### «Не бывае безыменных герояў — бываюць героі, чые імёны былі забытыя»

**Пачаўшы некалі пошукі экіпажа, які загінуў каля вёскі Падарэссе Старадарожскага раёна, я не магла нават здагадвацца, што ў гэтай гісторыі будзе працяг... Званок неабыякавага жыхара з вёскі Рабак Слуцкага раёна Міхаіла Іванавіча Сыцько, які паведаміў, што ў іх у лесе таксама ёсць помнік і месца падзення невядомага савецкага самалёта, зноў адправіў мяне ў дарогу.**

Тэму гібелі невядомага экіпажа недалёка ад вёскі Бярозаўка Слуцкага раёна (а дакладней, на краі балота, паміж вёскамі Аступішча і Таліца, ва ўрочышчы, названым Корзаўшчына—Саляншчына) мясцовыя жыхары спрабавалі падымаць неаднойчы. На працягу многіх гадоў лічылася, што тут загінуў знішчальнік — і адзін чалавек з экіпажа. Пра гэта ў 50-х гадах мінулага стагоддзя пісала апавяданне Алена Васілевіч. Журналісцкае расследаванне вёў таксама мой зямляк Міхась Тычына. Спрабавалі навесці архіўныя даведкі былы старшыня калгаса імя Тэльмана Віктар Магілявец, старшыня Паўстынскага сельсавета Святлана Жук і многія, многія іншыя. Таму, калі я звярнулася са сваёй просьбай аб дапамозе ў расследаванні гэтай гісторыі, ні адзін чалавек з бліжэйшых вёсак не застаўся ўбаку. Прыйшло і старэйшае, і маладое пакаленне. Падключылася Урэцкае лясніцтва. Старшыні Урэцкага выканкама і Казловіцкага сельвыканкама. Музей г. Любань, адміністрацыя г. Слуцка і нават палкоўнік у адстаўцы з Масквы, ураджэнец гэтых мясцінаў Барыс Няронскі. І я чарговы раз зразумела, што гэтая генетычная памяць, нягледзячы на ўсе навамодныя перапісванні гісторыі, навечна і трывала будзе працягваць у нас жыць.

СТАР. 5

## «ЗАЛАТЫЯ» ВЁСЛЫ ЗАСЛАЎЯ

### Нашы спартсмены выйгралі 14 узнагарод на дамашнім юнацкім і маладзёжным чэмпіянаце свету па веславанні

**Гэтым разам найбуйнейшы сусветны спартыўны турнір прымала не сталіца, а невялікі гарадок непадалёк ад Мінска — Заслаўе. У Беларусі сабралася рэкордная колькасць удзельнікаў — больш за тысячу спартсменаў з 62 краін. Сярод іх такія экзатычныя, як Эквадор, Філіпіны і Макаа, і такія далёкія, як, напрыклад, Канада і Бразілія. Нягледзячы на нядаўнія балючыя пытанні і неразуменне з боку Міжнароднай федэрацыі веславання, якія закранулі нашу краіну, арганізацыя гэтага чэмпіянату з боку краіны-гаспадыні зноў была на найвышэйшым узроўні.**

СТАР. 3



Фота БЕЛТА.